# Захоплены творчасцю

**З усіх сустрэч са знакамітымі творцамі, якія ладзіць Нацыянальная бібліятэка Беларусі, гэтая была самая незвычайная. У галерэю «Лабірынт» на творчы вечар «Ветразь лёсу» сабраліся тыя, хто ведае паэта, заслужанага дзеяча культуры Рэспублікі Беларусь Навума Гальпяровіча яшчэ і як вельмі цікавага публіцыста, папулярнага тэлевядучага, вопытнага радыёжурналіста. Яго аўтарскія праграмы ўздымаюць актуальныя пытанні культуры і гісторыі, на працягу многіх гадоў ён знаёміць нас з вядомымі грамадскімі і культурнымі дзеячамі краіны.**


*Падчас імпрэзы.*

Такая шматвектарнасць творчасці вядомага літаратара і вызначыла фармат сустрэчы — прысутныя задавалі пытанні пра яго літаратурную працу, жыццёвы шлях, захапленні. Да гэтай размовы бібліятэка падрыхтавала вялікую выставу, на якой прадстаўлены шматлікія зборнікі аўтара, часопісы, газеты з фондаў кніжніцы — яны сведчаць пра творчыя здабыткі Навума Гальпяровіча за час, што мінуў са з'яўлення яго першай публікацыі. З юнацтва захоплены творчасцю, ён і па сённяшні плённа працуе. На рахунку пісьменніка мноства кніг паэзіі і прозы, яго вершы пакладзены на музыку вядомымі беларускімі кампазітарамі.

Нечаканым для многіх прысутных стаў адказ пісьменніка на пытанне пра яго даўнюю прыхільнасць да спеваў. У доказ сваёй любові да песні вядомы паэт праспяваў, за што атрымаў ад прысутных заслужаныя апладысменты. Дарэчы, такі ж «песенны сюрпрыз» можа быць і ў сцэнарыі яго будучага творчага вечара, які адбудзецца ў Доме літаратара.

Напрыканцы сустрэчы прыхільнікі творчасці Навума Гальпяровіча мелі магчымасць атрымаць аўтограф пісьменніка на адным з яго самых вядомых зборнікаў «Сюжэт для Вечнасці».

**Яўген ПЯСЕЦКІ,**
**фота аўтара**